лячку, як яна танцуе і сьпявае. Бачу любую іх мамачку, як яна сядзіць з татам і гаворыць яму: „Гэта ня ты тапіўся, а я“. Бачу, як любыя мае дзетанькі пішуць мне лісты і пасылаюць мне перадачы. Любыя мае, ды ці перакажаш усё, што тут перадумалася і перасьнілася. Толькі–б Вы былі жывы і здаровы. Глядзеце сябе, мае даражэнькія, шануйцеся з здароўем, асьцерагайцеся, любыя, хвароб. Любая Анечка, усё гэта на цябе. А вы, мама, памагайце гадаваць сваіх унучак. Яны Вас ніколі не забудуць і будуць моцна любіць. Лорачка і Лялячка — харошыя дзетанькі і слаўныя. Як стане цёпла, я думаю, лепш Вам паехаць, мае дзетанькі, з бабуляю на вёску да Лёніка і Толіка. Ды і ты, Анечка, падумай, мо’ і табе лепш перавесьціся ў вясковую школу, мо’ там лягчэй будзе дзяцей гадаваць. Але табе, любая, цяпер відней. Сьпяшацца тут ня трэба. Як дазволяць пабачэньне, тады абгаворым усё. Анечка, як ты зрабіла з аблігацыямі? Я думаю, лепш іх прадаць усе. Таксама з грашыма, што я ўнёс у ЖАКТ „Камунар–асьвет[нік]“. Лепш іх забраць назад. Кватэру, абы жывы былі, нойдзем, як будзем разам. А цяпер трэба глядзець, каб не сядзець галоднымі ды халоднымі. Я табе паслаў даручэньні праз сьледаваццеля на перавод паю і атрыманьня 165 руб. грошай з ашчадкасы, ці атрымала ты? І ці патрэбны яшчэ даручэньні для ліквідацыі маіх рахункаў з „Камунара“?

Я паслаў быў табе некалькі даплатных лістоў, ці атрымала ты іх? Праўда, гэта было ў жніўні і верасьні прошлага году. У адным з іх я вітаў Лорачку з днём яе нараджэньня. Гэта было апошняе, больш не пасылаў.

Сам я здароў, толькі перад адлегаю дык у каленях ные, ды, часам, галава баліць. Але гэта ад духаты і тытунёвага дыму. Была ўбілася хвароба ў палец: гніў, але цяпер ужо загаіўся, і пазногаць з рубцом ужо сходзіць. Рукавы ў жакетцы я залапіў, дык цяпер цэлая. Я ўжо добра чытаю па–нямецку. Цяпер вучуся гаварыць. Перакладаю Рэмарка на беларускую мову, як выйду, мо’ выдадуць. Любыя мае, за мяне будзьце спакойны. Глядзеце сябе і шануйцеся з здароўем. Моцна, моцна цалую вас усіх, цябе, мая родная Анечка, сваіх любенятак Лорачку і Лялячку і маму.

Ваш *Адам*.

## № 38. Ганьне Бабарэцы

*7/II–1931 г.*

Дарагая Анечка!

Адсылаю 2 п[ары] бялізны, 2 п[ары] шкарпэтак, прасьціню, наўлачку, хустачку, анучкі, кубак, торбу.

Ліст паслаў даўно. Ці атрымала ты даручэньні?

Ці жывы дзеці? Чаму нічога не напісала?

Перадачу сёньнешнюю атрымаў. Шчыра дзякую.

Віншую Лялячку з трохгодзьдзем. Моцна–моцна цалую ўсіх вас.

Ваш *Адам*.